УДК 75(476)

***Р. Ф. Шаура,***
*доктар мастацтвазнаўства, прафесар*
*установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*
*культуры і мастацтваў», г. Мінск, Беларусь*

# ТВОРЧЫ І ПЕДАГАГІЧНЫ ШЛЯХ НАРОДНАГА МАСТАКА БЕЛАРУСІ І. В. АХРЭМЧЫКА

**Анатацыя.** У артыкуле разглядаецца творчы і педагагічны шлях народнага мастака Беларусі І. В. Ахрэмчыка. Яго імя ўпісана ў залаты фонд нацыянальнай мастацкай культуры як выдатнага майстра жывапісу, выхавацеля новага пакалення беларускіх мастакоў, якія ўнеслі вялікі ўклад у айчыннае і сусветнае выяўленчае мастацтва. У творчасці мастак аддаваў перавагу «вечным» тэмам: доблесці і мужнасці, гуманізму і прыгажосці.

**Ключавыя словы:** жывапіс, творчасць, мастацкая адукацыя, культурныя працэсы ў грамадстве, прыгажосць, гармонія.

***G. Shauro,***
*Doctor of Art History, Professor of the Educational Institution*
*"The Belarusian State University of Culture and Arts",*
*Minsk, Belarus*

# CREATIVE AND PEDAGOGICAL PATH PEOPLE’S ARTIST OF BELARUS I. AKHREMCHIK

**Abstract.** The article examines the creative and pedagogical path of the National Artist of Belarus I. Akhremchik. His name is inscribed in the golden fund of the national art culture as an outstanding master of painting, educator of a new generation of Belarusian artists, who subsequently made a huge contribution to the national and world fine arts. In his work, the artist gave preference to “eternal” themes: valor and courage, humanism and beauty.

**Keywords:** Painting, creativity, art education, cultural processes in society, beauty, harmony.

Імя Івана Восіпавіча Ахрэмчыка непарыўна звязана з асновай прафесійнай школы жывапісу ў Беларусі. Як мастак і настаўнік ён зрабіў вялікі ўклад у развіццё беларускай культуры ў 1940–1960 гг.

Творчасць І. В. Ахрэмчыка – асаблівая з’ява ў беларускай мастацкай культуры на мяжы 50–60-х гг. XX ст. Варта заўважыць, што мастак не арыентаваўся на дзяржаўныя спецза-

казы адлюстравання магутнай будоўлі, перадавікоў вытворчасці. Прыярытэтнымі кірункамі яго творчых інтарэсаў заставаліся вечныя каштоўнасці: гісторыя і культура, маральнасць і высакароднасць, доблесць і мужнасць, гуманізм і прыгажосць. Талент і яркая індывідуальнасць мастака паставілі яго ў шэраг прызнаных класікаў выяўленчага мастацтва не толькі Беларусі, але і далёка за яе межамі. Ідучы па дарозе мастацтва, пракладзенай сваімі папярэднікамі, фарміруючы індывідуальны мастацкі вопыт у атмасферы тых гадоў, ён цалкам успрыняў дасягненні мастацкай думкі з глыбіні гістарычных эпох, атрымліваючы асабісты зарад творчага працэсу. Эстэтыка сапраўднага разумення задач і сутнасці выяўленчага мастацтва з самага пачатку творчай дзейнасці станавілася іманентнай асновай яго дзейнасці. Мастацкія вобразы заўсёды заставаліся калі не роўнымі, то выключна блізкімі да рэалістычнага метаду раскрыцця выяўленча-выразнага, умоўна зададзенага апавядальнага тэксту. У тонкім выкананні вобразных крытэрыяў прыкметна выяўляўся высокамастацкі густ і разуменне законаў прыгажосці і гармоніі. Творчасці І. В. Ахрэмчыка характэрна глыбокае пранікненне і адчуванне маральна-эстэтычнага ўспрымання чалавечых жыццёвых праблем, веданне і разуменне культурных працэсаў у грамадстве.

Мастацтва І. В. Ахрэмчыка заўсёды адрознівалася канцэптуальным поглядам на свет, эмацыянальным успрыманнем падзей навакольнага жыцця, з-за чаго яго працы атрымлівалі магутны зарад экспрэсіі, высокую змястоўнасць сімвалічнага іншасказання. Вялікую ролю ў станаўленні майстра адыгрывала творчая атмасфера, тыя абставіны, якія ўключалі масу значных і роўнавялікіх фактараў. Гэта, перш за ўсё, стан выяўленчага мастацтва і агульнай мастацкай культуры на той момант і стаўленне да яе грамадства; кола ідэй і памкненняў, якія віталі ў думках інтэлектуалаў; мера інавацый і наватарства ў поглядах, і нарэшце, творчы патэнцыял яго сучаснікаў, тых, хто працаваў побач, ствараючы своеасаблівую аўру мастацкіх пошукаў.

У гісторыі мастацтваў ёсць шмат прыкладаў, калі ўзаемнае ўзбагачэнне і сама творчая актыўнасць сяброў і калег па «цэху» стымулявалі мастацкія пошукі, паскаралі развіццё не толькі індывідуальна кожнага мастака, але і цэлага пакалення

творцаў. Усё гэта аказала велізарны ўплыў не толькі на сучаснікаў І. В. Ахрэмчыка, але і на наступныя пакаленні.

Мастакі шукалі адпаведныя выяўленча-выразныя шляхі перадаць сваё стаўленне не толькі да таго, што адбываецца ў жыцці, але і імкнуліся апець у мастацка-паэтычных вобразах яго будучыню. Такое наватарства патрабавала ад маладых мастакоў не толькі смеласці ўжывання мастацкай формы, але і глыбокіх ведаў.

Творчасці І. В. Ахрэмчыка ў шматфігурных манументальных працах уласцівыя жыццесцвярджальны пафас і сацыяльная вастрыня, гістарычная дакладнасць і мастацкі выраз перадавых ідэй свайго часу. Натуральна, мастацтва, прызнанае выказаць самасвядомасць народа, патрабавала ад мастака не павярхоўнага, а глыбокага, філасофскага падыходу да тэмы. Так нараджаліся вобразы мастацкага абагульнення, у якіх акцэнтавалася філасофская паэтычная сутнасць таго, што адбывалася ў падзеях таго часу. Захоўваючы і развіваючы традыцыі высокай грамадзянскасці, мастак, як правіла, прымушае сябе шукаць найбольш выразныя мастацкія сродкі для ўвасаблення ідэйнага і вобразнага зместу твора і такім шляхам дае магчымасць гледачу зноў перажыць гістарычныя падзеі, але ўжо ў новым асэнсаванні яго сутнасці як з’явы, якая знайшла адлюстраванне ў выяўленчых змястоўных тэкстах.

Але не толькі ў мастацкіх творах І. В. Ахрэмчык заявіў сябе як выдатны творца. Ён шмат зрабіў добрых і карысных спраў на ніве выхаваўчай дзейнасці. Трэба адзначыць, што педагагічны шлях І. В. Ахрэмчыка ў галіне мастацка-адукацыйнага працэсу быў шматгранны і доўгі. Пачынаўся ён з перыяду выкладання ў Віцебскім мастацкім тэхнікуме (1931–1941).

Да прыезду І. В. Ахрэмчыка на выкладчыцкую працу ў Віцебскім мастацкім тэхнікуме яшчэ панаваў метад калектыўнай працы. У гэты час многія педагогі, якія стаялі ля вытокаў арганізацыі тэхнікума, раз’ехаліся. Схлынула і хваля супрэматычных эксперыментаў і навацый у мастацтве, якая ўносіла значныя спрэчкі і дыскусіі ў педагагічны працэс тэхнікума. Трэба было тэрмінова мяняць абстаноўку і наладжваць навучальны працэс. Гэтая місія выпала на долю І. В. Ахрэмчыка, які стаў дырэктарам Віцебскага мастацкага тэхнікума.

За перыяд кіраўніцтва Віцебскім мастацкім тэхнікумам была падрыхтавана вялікая плеяда спецыялістаў у галіне жывапісу,

графікі, скульптуры, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, якая пасля стала магутнай творчай асновай нацыянальнай мастацкай культуры Беларусі.

У пасляваенны перыяд, сумяшчаючы з актыўнай творчай дзейнасцю, І. В. Ахрэмчык ажыццяўляў значную педагагічную працу ў Мінскім мастацкім вучылішчы (1948–1952), Беларускім політэхнічным інстытуце (1953–1963), Беларускім тэатральна-мастацкім інстытуце (1963–1971).

У гэты час творчасць І. В. Ахрэмчыка самым непасрэдным чынам суадносілася са стылявымі і стылеўтваральнымі напрамкамі ў выяўленчым мастацтве гэтай эпохі. З канца 1950-х гг. выяўленчае мастацтва і жывапіс перажывалі кардынальныя змяненні. Сведкам гэтых змен з'явіўся так званы «суровы стыль», які актыўна развіваўся ў тым перыядзе. Час запатрабаваў ад мастакоў паглыбленага асэнсавання суровых і драматычных бакоў рэчаіснасці, што найбольш грунтоўна выявілася ў звароце жывапісцаў да тэмы Вялікай Айчыннай вайны, яе ўплыву на духоўны свет чалавека. І асобнае месца ў мастацтве займала творчасць і педагагічная дзейнасць народнага мастака Беларусі Івана Восіпавіча Ахрэмчыка.

1. *Аладова, Е. В.* И. О. Ахремчик / Е. В. Аладова. – М. : Сов. художник, 1960. – 55 с.

2. *Ваданосава, Ф.* Майстар партрэта Іван Ахрэмчык / Ф. Ваданосава // Роднае слова. – 1993. – № 12. – С. 32.

3. *Тараканава, М.* Партрэтны жывапіс Івана Ахрэмчыка: карціна «Якуб Колас і Янка Купала» / М. Тараканава // Роднае слова. – 2003. – № 12. – С. 68–69.

УДК 7.046.1+398

***А. В. Шаціла,***
*старшы выкладчык кафедры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», г. Мінск, Беларусь*

## СПЕЦЫФІКА ЎВАСАБЛЕННЯ МІФАЛАГІЧНЫХ ВОБРАЗАЎ У СУЧАСНЫМ МАСТАЦТВЕ

**Анатацыя.** У артыкуле разглядаецца спецыфіка ўвасаблення міфалагічных вобразаў у сучасным мастацтве. Аўтар адзначае, што міфала-